***С.В.Мартынкевіч*** *(Рэспубліка Беларусь, Віцебск,*
*Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі)*

# ПРАБЛЕМНЫ МЕТАД У СІСТЭМЕ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

*У артыкуле разглядаецца сутнасць праблемнага метаду навучання мове з пазіцый патрабаванняў сучаснага адукацыйнага працэсу. Вызначаюцца мэты і задачы праблемнага навучання ў аспекце маўленчага і камунікатыўнага развіцця вучняў, стымулявання іх пазнавальнай актыўнасці, павышэння матывацыі да вывучэння беларускай мовы. У артыкуле асобая ўвага ўдзяляецца сітуацыйнай аснове праблемнага навучання мове, разглядаюцца прыклады праблемных сітуацый.*

***Ключавыя словы:*** *працэс навучання беларускай мове; праблемны метад; праблемная сітуацыя; моўны матэрыял; дыдактычныя тэксты.*

*The essence of the problematic method of language learning is considered in the article from the point of view of the requirements of the modern educational process. The goals and objectives of problem-based learning are defined in the aspect of speech and communication development of students, stimulation of their cognitive activity, and increase of motivation to study the Belarusian language. In the article, special attention is paid to the situational basis of problematic language learning, examples of problematic situations are considered.*

***Keywords:*** *the process of learning the Belarusian language; problematic method; problematic situation; language material, didactic texts.*

На сучасным этапе развіцця адукацыі відавочна, што “з усіх асноўных метадалагічных падыходаў … у якасці базавых можна вылучыць тыя, што ў першую чаргу арыентаваны на формы і метады навучання навыкам і кампетэнцыям XXI стагоддзя” [1, с. 362]. Глабальная інфарматызацыя грамадства вызначае найбольш запатрабаванымі для сучаснага чалавека навыкі здабываць інфармацыю, крытычна яе ацэньваць, інтэрпрэтаваць, вызначаць дакладнасць і дарэчнасць фактаў адносна яе выкарыстання. Мэта артыкула – разгледзець сутнасць праблемнага метаду навучання беларускай мове з пазіцый патрабаванняў сучаснага адукацыйнага працэсу; вызначыць мэты і задачы праблемнага навучання ў аспекце маўленчага і камунікатыўнага развіцця вучняў, прапанаваць прыёмы стымулявання іх пазнавальнай актыўнасці, павышэння матывацыі да вывучэння беларускай мовы.

У згаданым кантэксце праблемны падыход канцэптуальна адпавядае сённяшняй адукацыйнай парадыгме, які накіроўвае адукацыйны працэс на “дасягненне вучнямі асобасных, метапрадметных і прадметных адукацыйных вынікаў, развіццё творчых здольнасцей вучняў, уключэнне іх у розныя віды сацыяльна значнай дзейнасці” [2, с. 33]. Аднак варта памятаць,

што “праблемнае засваенне развівае мысленне вучня не таму, што настаўнік ставіць праблему, а таму, што вучань сам яе вырашае” (М.І.Махмутаў) [3, с. 124]. Гэта спрыяе фарміраванню матывацыі дасягнення поспеху, актывізуе пазнавальную актыўнасць у працэсе навучання.

Пры навучанні беларускай мове праблемная аснова дазваляе вырашыць наступныя задачы:

- прыцягнуць увагу вучня да вучэбнага моўнага матэрыялу, выклікаць у яго пазнавальную цікавасць;
- актывізаваць разумовую дзейнасць вучняў;
- дапамагчы вучню вызначыць асноўную праблему моўнай задачы і план даследавання асаблівасцей моўнай з’явы;
- дапамагчы вучню вызначыць межы актуалізаваных раней засвоеных ведаў і ўказаць напрамак пошуку найбольш рацыянальнага шляху выхаду з сітуацыі цяжкасці;
- заахвоціць вучня да актыўнай маўленчай дзейнасці;
- прадэманстраваць механізмы пераходу моўнага закону ў практыку маўлення, калі кожнае моўнае правіла становіцца маўленчай нормай.

Такім чынам, дасягненне мэты навучання беларускай мове адбываецца праз:
1) засваенне сістэмы ведаў, фарміраванне ўменняўу разнастайных відах маўленчай дзейнасці, развіццё моўнай, маўленча-камунікатыўнай, сацыякультурнай і лінгвакультуралагічнай кампетэнцый;

2) развіццё асобы вучня, яго творчых здольнасцей, цікавасці да вывучэння беларускай мовы; фарміраванне жадання і ўмення вучыцца;

3) выхаванне маральных і эстэтычных пачуццяў, эмацыйна-каштоўнаснага пазітыўнага стаўлення да сябе і навакольнага свету, захаванне і ўмацаванне індывідуальнасці вучня.

У аснове праблемнага метаду навучання – паслядоўнае і мэтанакіраванае стварэнне настаўнікам праблемных сітуацый, фармулёўка вучэбных задач. Функцыі настаўніка:

- фасілітатарская функцыя (настаўнік стварае роўныя ўмовы для навучання, правярае гатоўнасць вучняў да вырашэння даследчых задач, кіруе працэсам даследавання);
- даследчая функцыя (настаўнік не паведамляе веды ў гатовым выглядзе, а накіроўвае вучняў на пошук спосабаў вырашэння пастаўленай праблемы ці задачы);
- кансультатыўная функцыя (настаўнік як суразмоўца дае інструкцыі, кансультуе па асобных пытаннях, кіруючыся прынцыпам пераемнасці і апераджэння ў вывучэнні моўнага матэрыялу);
- экспертная функцыя (настаўнік як эксперт вызначае выніковасць вырашэння пастаўленай праблемы).

Пры гэтым настаўнік матывуе вучняў да працы, памятае, што праблемныя задачы паступова ўскладняюцца, дапамагае захоўваць сістэму аргуметаў у вырашэнні праблемы, прапаноўвае заданні адносна розных відаў маўленчай

дзейнасці (вусныя, пісьмовыя, чытанне тэкстаў, абмеркаванне і інш.).

Структура распрацоўкі метаду праблемнага навучання ўключае вучэбную праблему, праблемную сітуацыю, гіпотэзу і "звязаныя з імі паняцці: праблемнасць выкладання, праблемнае навучанне, праблемнасць зместу, разумовы пошук, праблемнае пытанне, праблемны выклад і інш." [3, с. 93]. У працэсе навучання беларускай мове найбольш эфектыўнымі з'яўляюцца праблемнае выкладанне, часткова-пошукавы і даследчы метады. У цэнтры ўвагі знаходзіцца праблемная сітуацыя, якая павінна адпавядаць інтэлектуальным магчымасцям вучняў і выклікаць у іх гатоўнасць разважаць, а гэта значыць – эксперыментаваць і даказваць.

Сярод праблемных сітуацый можна вылучыць наступныя:

- "сітуацыі-альтэрнатывы", што будуюцца на супрацьлеглых меркаваннях, якія вучням трэба ацаніць з дапамогай стратэгій крытычнага мыслення;
- "сітуацыі-пасткі", якія вызначаюцца пярэчаннямі або недастатковасцю інфармацыі, для вырашэння якіх патрэбныя рэгулятыўныя ўменні – кантроль, ацэнка, рэфлексія;
- "сітуацыі-алгарытмы", якія будуюцца на абавязковым паслядоўным выкананні дзеянняў згодна з пастаўленай задачай, не здзейсніўшы пэўны крок, не маеш права перайсці да наступнага этапу працы;
- "сітуацыі-даследаванні", якія ўтрымліваюць пэўную гіпотэзу і патрабуюць нестандартнага падыходу і арыгінальнага вырашэння.

Асаблівая ўвага на ўроку беларускай мовы пры такім падыходзе ўдзяляецца дыдактычным тэкстам, на аснове якіх распрацоўваюцца адпаведныя практыкаванні. Тэкст становіцца аб'ектам аналізу і вынікам маўленча-камунікатыўнай дзейнасці незалежна ад таго, якая моўная тэма вывучаецца ў кожным канкрэтным выпадку. Тэксты павінны мець сітуацыйную аснову, якая актывізуе адбор моўных сродкаў істымулюе маўленне вунчяў. Заданні да практыкаванняў суадносяцца з кірункамі праблемы, сфармуляванай настаўнікам або вылучанай вучнямі, і разумовымі аперацыямі, якія здзяйсняюцца ў час працы з тэкстам. Яны носяць аналітычны, аналітыка-сінтэтычны і сінтэтычны характар.

Праблемныя тэксты з'яўляюцца трывалай асновай сітуацый, накіраваных на развіццё маўлення вучняў, бо "вучні авалодаюць маўленча-камунікатыўнымі ўменнямі ў тым выпадку, калі ім будзе прапанавана адпаведная спецыяльным чынам арганізаваная камунікатыўная дзейнасць – рознабаковая, цікавая, матываваная, кантралюемая, асобасна значымая" [4, с. 182]. Настаўнік дапамагае вучням дзейнічаць незалежна ад іншых, не стрымлівае ініцыятывы, не падказвае і не дае прамых інструкцый адносна таго, што яны здольныя выканаць самастойна. Настаўнік рэальна ацэньвае моцныя і слабыя бакі сваіх вучняў у іх магчымасцях вырашаць праблемы. Важна стымуляваць імкненне да самастойнасці ў працэсе засваення ведаў, творчасці пры выпрацоўцы маўленчых уменняў, трываласці набытых камунікатыўных навыкаў.

Настаўнік павінен прадумаць не толькі тое, які матэрыял будзе паведамляцца дадаткова, але і прадбачыць, што з гэтага матэрыялу грунтуецца на суб'ектным

вопыце вучняў як выніку іх папярэдняга навучання і ўласнай жыццядзейнасці. Пры гэтым абмяркоўваць “версіі” вучняў не ў ацэначнай сітуацыі (правільна – няправільна), а ў раўнапраўным дыялогу, абагульняць гэтыя “версіі”, вылучаць і суадносяць з тэмай урока, задачамі і мэтай навучання.

Такім чынам, праблемны разгляд матэрыялу завяршаецца наступнымі аперацыямі:

- абагульненнем атрыманых ведаў і ўменняў, ацэнкай іх засваення;
- аналізам вынікаў групавой і індывідуальнай працы;
- характарыстыкай працэсу выканання заданняў, а не толькі канчатковага выніку;
- абмеркаваннем таго, што даведаліся, што спадабалася ў працэсе працы (не спадабалася) і чаму.

Выніковасць заняткаў з выкарыстаннем праблемнага метаду вызначаецца фарміраваннем ў вучняў як інтэлектуальнага, так і маральнага, эстэтычнага, сацыяльна апраўданага вопыту. Значным з’яўляецца развіццё творчай самастойнасці – уменняў асэнсоўваць, аргументаваць, абараняць выказаную думку.

Фарміраванне актыўнага вучня, свядомага ў адносінах да набыцця ведаў і навуковага пошуку, – працэс працяглы і працаёмкі. Праблемны характар арганізацыі навучання паспрыяе мэтанакіраванаму развіццю і самаразвіццю асобы вучня, асобаснаму станаўленню і самавызначэнню, што ў выніку і з’яўляецца сведчаннем якасці адукацыі.

**Літаратура**


1. Теоретико-методологические основания развития дошкольного, общего среднего и специального образования в Республике Беларусь: В 2 ч. – Ч. 1 / Н.П.Баранова [и др.]. – Мінск: НІА, 2023. – 480 с.
2. Образовательные стандарты общего среднего образования. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homeru/ obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god. – Дата доступа: 02.12.2023.
3. Махмутов, М.И. Избранные труды: В 7 т. / М.И.Махмутов. — Казань: Магариф–Вакыт, 2016. – 423 с.
4. Яленскі, М.Г. Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе / М. Г.Яленскі. – Мн.: НІА, 2002. – 212 с.